WNA была взята из журнала «Старая монета» (№ 4, 1910. С. 11), сообщавшего, помимо этого, что монеты были серебряными «польско-литовскими» и переданы в университет из ИАК.

Предметы клада переслали в Тверь, видимо, как и в Варшаву, в марте 1910 г. Причем, описывая место находки, оба раза местечко Кричев ошибочно «поместили» в Климовичский уезд, а не в Чериковский. Предположительное время обнаружения всего комплекса можно уточнить как 1909 – начало 1910 г.

24 монеты клада, поступившие в Тверской музей, утрачены во время оккупации г. Калинина в 1941 г. Местоположение 47 «варшавских» экземпляров теперь тоже вряд ли определимо.

## Список литературы

*Колосов В. И.* Тверской музей и его приобретения в 1910 г. Тверь, 1911.

*Рябцевич В. Н.* Денежное обращение и клады на территории Чернигово-Северской земли и восточной Белоруссии в XVI в. // Нумизматика и сфрагистика, Т. III, Киев, 1968. С. 168–187.

*Рябцевич В. Н.* Денежные депозиты XIV–XVI вв. на территории Могилевщины // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць. Трэцяя Міжнародная навуковая канферэнцыя. Магілёў, 2003. С. 14–19.

*Mikołajczyk A.* Skarby monet z XVI, XVII i XVIII wieku zanotowane na byłym obszarze Wielkiego Księstwa Litewskiego. Materiały do inwentaryzacji // Prace i materiały Museum archeologicznego i etnograficznego w Łódźi. Serja numizmatyczna i konserwatorska. Łódź, 1985, Nr. 5. S. 129–196.

**М. В. Клімаў**
*Мінск, Беларусь*
**В. А. Кабрынец**
*Пінск, Беларусь*

# ПАДЗЕІ ІНФЛЯНЦКАЙ ВАЙНЫ НА ПОЛАЧЧЫНЕ ПА ЗНАХОДКАХ РУСКІХ МАНЕТ: АРХЕАЛАГІЧНЫ І НУМІЗМАТЫЧНЫ АСПЕКТЫ

Інфлянцкая (Лівонская) вайна пачалася ў 1558 г. У 1562–1563 гг. яе падзеі непасрэдна пачалі разгортвацца на тэрыторыі Полаччыны. Пасля захопу Полацка маскоўскімі войскамі Івана IV Жахлівага (1547–1584) у лютым 1563 г., з мэтай утрымання захопленай тэрыторыі, вакол Полацка



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

было пабудавана 7 фартэцый: Тuроўля, Сокал, Казьян, Сітна, Суша, Красны, Няшчэрда. У 1579 г. усе гэтыя фартэцыі былі захоплены або здаліся войскам Рэчы Паспалітай. Першае археалагічнае абследаванне фартэцый было распачата ў 1948 г. маскоўскім археолагам М. Г. Рабіновічам, працягнута напрыканцы 60-х гг. XX ст. беларускім археолагам М. А. Ткачовым. З 2014 г. М. В. Клімавым было адноўлена абследаванне былых фартэцый: побач з фартэцыяй Туроўля (в. Гарадзішча Полацкага раёна) і ў фартэцыі Сокал (побач з в. Кульнева Расонскага раёна) у 2014–2017 гг. былі праведзены археалагічныя раскопкі і выяўлены разнастайны матэрыял, які звязаны з ваеннай і побытавай дзейнасцю стралецкага войска, у тым ліку манеты.

Усяго падчас раскопак у Туроўлі (2014–2015 гг.) і ў Сокале (2016–2017 гг.) былі знойдзены 42 манеты, аплаўлены кавалак срэбра і 3 манетападобныя фрагменты. Сярод іх толькі дзве манеты належылі чаканцы ВКЛ і РП – двудэнарый Жыгімонта II Аўгуста (1545–1572), адчаканены ў 1567 г., і медны шэляг Яна II Казіміра Ваза (1648–1668). Усе астатнія выраблены на дзенежных дварах Вялікага княства Маскоўскага і Рускага царства. Сярод рускіх манет прадстаўлены 5 пул, 4 палушкі, 22 дзенгі, 9 капеек. Як відаць з вызначэння, сярод знойдзеных манет пераважаюць дробныя наміналы – пула, палушка і дзенга. Асноўным месцам іх вытворчасці былі такія цэнтры, як Масква і Цвер. У межах даследаванай плошчы фартэцый (Сокал, Туроўля) манеты траплялiся як сярод спаленых рэшткаў драўляных пабудоў, так і побач з імі.

Акрамя пазначаных месцаў археалагічных даследаванняў, знаходкі рускіх манет вядомы яшчэ ў адным месцы на Полаччыне – у ваколіцах воз. Няшчэрда, але гэтыя манеты былі выяўлены не археолагамі. Такія манеты ў гады Лівонскай вайны на Полаччыне канцэнтраваліся ў месцах знаходжання фартэцый не выпадкова, бо на ўтрыманне іх гарнізонаў з царскай казны вылучаліся грашовыя сродкі ў рускай манеце.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm